www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

8 лістапада 2005 года, № 19 (1927)

ПАДЗЕІ

## НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БДУ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ



**31 кастрычніка** адбылося пашыранае пасяджэнне рэктарата, прысвечанае 84-й гадавіне Белдзяржуніверсітэта. На ім прысутнічалі кіраўнікі падраздзяленняў БДУ, а таксама выкладчыкі і студэнты.

Быў заслуханы даклад першага прарэктара БДУ, прафесара С.К. Рахманава. Сяргей Кімавіч прадставіў увазе слухачоў панараму гісторыі стварэння і развіцця універсітэта, студэнцкага навуковага жыцця, універсітэцкіх кадраў, навуковай інфраструктуры, асноўных кірункаў і вынікаў навуковай дзейнасці. Сваё выступленне ён дапоўніў паказам дыяграм і табліц.

Першыя крокі па арганізацыі кіравання навукай у БДУ былі зроблены пры першым рэктары У.І. Пічэту, які быў ініцыятарам стварэння агульнауніверсітэцкага навуковага таварыства. Даследаванні навукоўцаў публікаваліся ў "Працах БДУ", што рассылаліся ў найбольш буйныя бібліятэкі свету. Таварыства працавала па наступных кірунках: навукова-тэхнічная інфармацыя, арганізацыя навуковай інфраструктуры, навуковая праца студэнтаў, развіццё кантактаў з замежнымі навукоўцамі, папулярызацыя навуковых ведаў, правядзенне навуковых канферэнцый, падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі, вучэбна-метадычная праца.

Але гэта гісторыя. А чым слаўная навука БДУ сёння? У фае геаграфічнага факультэта была арганізавана выстаўка-прэзентацыя навукова-тэхнічных дасягненняў БДУ, за якія універсітэт узнагароджаны шматлікімі дыпломамі на міжнародных конкурсах. У БДУ, як і ва ўсім свеце, дынамічна развіваюцца такія перспектыўныя кірункі навуковых даследаванняў, як фізіка біясістэм, фізіка нізкапамерных сістэм, метады прыняцця рашэнняў у кіраўнічых сістэмах, ахова інфармацыі, нанахімія, генетычныя механізмы жыццядзейнасці і інш. Супрацоўнікі універсітэта распрацавалі мікрахвалевыя тэхналогіі, якія дазваляюць павысіць ураджайнасць гароднінавых культур на 10—12 %, абсталяванне для сушкі драўніны, якое забяспечвае зніжэнне вільготнасці да 8 % у суткі. На выстаўцы былі прадстаўлены камп'ютарна-арыентаваныя сродкі вымярэння (лічбавыя асцылографы, аналагава-лічбавыя пераўтваральнікі, сістэмы вымярэння вібрацыі і дыягностыкі механізмаў і машын). Была прэзентавана мабільная водаачышчальная ўстаноўка для атрымання пітной вады з забруджаных крыніц, здольная вырабіць 2,5 тоны чыстай вады за 3 гадзіны (!). Акрамя таго, ва універсітэце займаюцца распрацоўкай дабавак для хлебапякарнай галіны прамысловасці. Распрацаваны інфармацыйныя сістэмы "Абітурыент" (поўная інфармацыя пра ўступную кампанію), "Студэнты" і сістэма дыстанцыйнай адукацыі "eUniversity", пры дапамозе якой вядзецца навучэнне каля 50 тысяч студэнтаў па 8000 курсаў. Усе гэтыя распрацоўкі абяцаюць беларускай навуцы выдатную будучыню.

**Ала МАЧАЛАВА**

БДУ-NEWS

## ЮБІЛЕЙ, ПЕРАПЫНЕНЫ ВАЙНОЙ

**9—11 лістапада** ў актавай зале Ліцэя БДУ адбудуцца сустрэчы рэктара БДУ, прафесара В.І. Стражава з першакурснікамі і дыялог-семінар па кнізе "Беларускі дзяржаўны універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.". У рамках сустрэч будзе паказана тэатральна-мастацкая кампазіцыя "Юбілей, перапынены вайной", прысвечаная памяці студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Кампазіцыя — своеасаблівы напамін пра ўрачыстасці, якія павінны былі адбыцца ў нашым універсітэце ў чэрвені 1941 г., калі БДУ рыхтаваўся адзначаць сваё 20-годдзе. Прэм'ера адбылася на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БДУ 29 чэрвеня, прысвечаным Дню незалежнасці Беларусі і 60-годдзю Вялікай Перамогі.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

## ГАНАРОВЫЯ ГОСЦІ

Наш універсітэт **28 кастрычніка** наведала дэлегацыя Масквы на чале з намеснікам мэра Міхаілам Аляксандравічам Менем. Госці прыехалі ў Мінск на запрашэнне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі.

Дэлегацыя прыняла ўдзел ва ўрачыстым пасяджэнні Савета Інстытута тэалогіі БДУ, прысвечаным наданню М.А. Меню звання ганаровага доктара інстытута "за вялікі ўнёсак у фарміраванне сучасных прынцыпаў узаемаадносінаў Царквы і дзяржавы і за ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй".

## ПРАГРАМІСТЫ ПАЕДУЦЬ У ПЕЦЯРБУРГ

Вынікі 1/4 фіналу каманднага чэмпіянату свету па праграміраванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёну (Беларусь і краіны Балтыі) былі падведзены **27 кастрычніка**. Сярод пераможцаў апынулася і каманда БДУ.

У БДУ спаборніцтвы такога кшталту праводзіліся ўжо ў восьмы раз. Гэты год стаў рэкордным па колькасці — 47 каманд. Разам з камандай БДУ найлепшымі сталі прадстаўнікі Латвійскага універсітэта і Расійскага універсітэта імя І. Канта з Калінінграда. Гэтыя каманды разам з іншымі васьмю (Беларусь прадстаўляюць яшчэ студэнты Гомельскага універсітэта) адправяцца ў Санкт-Пецярбург, дзе адбудуцца паўфінальныя спаборніцтвы.

**Ірына ШЫК**

СВЯТЫ

## БДУ-Holiday-2005



Так называлася танцавальна-забаўляльная праграма, прысвечаная 84-годдзю нашай alma mater. **31 кастрычніка** ў памяшканні Палаца спорту сабралося каля 4 тысяч запрошаных на дзень нараджэння БДУ. Для іх выступілі танцавальны гурт "Арыён", брэйк-данс-калектыў "Street Masters" (яны паказалі праграму, з якой выступалі на чэмпіянаце "Batle-Belarus-2005"), сваімі жартамі павесяліла каманда КВЗ "Радыё БДУ", спяваў Андрэй Дзяркоў — лідэр праекта "Тайланд", а таксама Элен Мендонца, якая прадставіла праграму ў стылі MORCHEEBA.

Але галоўнай падзеяй вечарыны сталі выбары Каралевы свята — конкурс "Міс універсітэта". Дзяўчаты дэманстравалі купальнікі, танчылі, спявалі — словам, паказвалі свае таленты публіцы. Па выніках танцавальнага і песеннага конкурсаў журы пакінула толькі 5 з 16 дзяўчат. Лепшую з іх выбрала публіка шляхам галасавога пацвярджэння сваіх сімпатый. У конкурсе перамагла Алёна Нарушэвіч (пра яе вы чыталі ў пазамінулым нумары "Універсітэта": дзяўчына атрымала званне "Міс Інтэрнэт-2005"). Віншуем!

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

КОНКУРСЫ

## Найлепшыя ПРАЕКТЫ

Абмеркаванне праектаў, якія паступілі на конкурс "Лепшы маладзёжны праект", адбылося **26 кастрычніка**. Экспертная камісія на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворавым вырашыла ўзнагародзіць першым месцам і грантам праект "Студэнцкая відэастудыя SVS". Кіраўнік праекта Я. Якіменка (III курс ФПМІ) і куратары Ю.В. Лазар і К.В. Кулінковіч (метадысты студгарадка) прадставілі добраахвотнае студэнцкае аб'яднанне, створанае на базе студгарадка, якое займаецца інфармацыйнай дзейнасцю. Мэты праекта — стварэнне эфектыўнай сістэмы інфармавання, асвятленне дзейнасці органаў студэнцкага самакіравання. Відэастудыя сфарміравана з прадстаўнікоў інфармацыйных камісій студсаветаў інтэрнатаў, членаў грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка БДУ. На цяперашнім этапе праект праходзіць апрабацыю: зняты і размешчаны ў лакальных сетках інтэрнатаў шэраг інфармацыйных сюжэтаў, у падрыхтоўцы якіх непасрэдны ўдзел прымалі студэнты — члены відэастудыі. У планах — 15-хвілінная інфармацыйная праграма, складзеная з блокаў рознай тэматыкі, якая будзе з'яўляцца ў сетках штотыднёва. У хуткім часе да сеткі падключаць інтэрнаты № 1 і № 5.

Другое месца атрымаў праект "Студэнцкі псіхалагічны клуб БДУ". Кіраўнік праекта студэнт II курса факультэта радыёфізікі і электронікі Я.Глазаў і куратар А.У. Шапашнікава (педагог-псіхолаг псіхалагічнай службы БДУ) вырашылі арганізаваць студэнтаў, якія цікавяцца псіхалогіяй, для фарміравання псіхалагічнай культуры студэнцтва БДУ і стварэння "стабільнага пазітыўнага студэнцкага асяроддзя". Пра значнасць гэтага праекта гавораць лічбы: штогод да паслуг студэнцкай псіхалагічнай службы звяртаецца больш за 1000 студэнтаў.

Трэцяе месца было прысуджана тэатру-студыі "Божая кароўка" (кіраўнік праекта — студэнт III курса Інстытута тэалогіі М. Міроненка, куратар — начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы БДУ І.П. Латушка). Вялікая колькасць здзейсненых пастановак, сацыяльная накіраванасць вылучылі "Божую кароўку" з шэрага астатніх праектаў, якіх у гэтым годзе было прадстаўлена больш за 20.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

# ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2004—2005 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ ПА ЎДАСКАНАЛЕННІ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У 2005—2006 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

*Пашыранае пасяджэнне Вучонага савета нашага ўніверсітэта адбылося 3 кастрычніка. З асноўным дакладам на тэму "Вынікі работы БДУ ў 2004—2005 навучальным годзе і задачы па ўдасканаленні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у 2005—2006 навучальным годзе" выступіў рэктар БДУ, прафесар В.І. Стражаў. Прапануем вашай увазе асноўныя палажэнні даклада ў табліцах і дыяграмах.*

### Конкурсы сярод паступаючых у БДУ на 1-ы курс дзённай формы навучання (2001—2005 гг.)

| Год | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 |
|---|---|---|---|---|---|
| Конкурс | 3,45 | 3,5 | 3,1 | 4,2 | 3,94 |

### Доля ад агульнай колькасці тых, хто падаў заявы на дзённую бюджэтную форму і быў залічаны на 1-ы курс




### Колькасць мінчан і выпускнікоў вясковых школ, залічаных на дзённую платную форму на 1-ы курс па БДУ

| | 2004 год | | 2005 год | |
|---|---|---|---|---|
| | Чал. | У % ад усіх платнікаў | Чал. | У % ад усіх платнікаў |
| Залічана мінчан на дзённую платную форму | 819 | 46,5 | 1018 | 52,3 |
| Залічана ўсяго на дзённую платную форму | 1762 | | 1946 | |

| | 2004 год | | 2005 год | |
|---|---|---|---|---|
| | Чал. | У % ад усіх платнікаў | Чал. | У % ад усіх платнікаў |
| Залічана выпускнікоў вясковых школ на дзённую платную форму | 100 | 5,7 | 94 | 4,8 |
| Залічана ўсяго на дзённую платную форму | 1762 | | 1946 | |

### Колькасць мінчан і выпускнікоў вясковых школ, залічаных на дзённую форму (бюджэтная і платная разам) на 1-ы курс па БДУ

| | 2004 год | | 2005 год | |
|---|---|---|---|---|
| | Чал. | У % ад усіх залічаных | Чал. | У % ад усіх залічаных |
| Залічана мінчан на дзённую форму | 1643 | 43,5 | 1794 | 45,4 |
| Залічана ўсяго на дзённую форму | 3773 | | 3952 | |

| | 2004 год | | 2005 год | |
|---|---|---|---|---|
| | Чал. | У % ад усіх залічаных | Чал. | У % ад усіх залічаных |
| Залічана выпускнікоў вясковых школ на дзённую форму | 373 | 9,9 | 347 | 8,9 |
| Залічана ўсяго на дзённую форму | 3773 | | 3952 | |

### Пасляховасць студэнтаў па выніках вясенняй экзаменацыйнай сесіі (дзён. ад.)



| год | % |
|---|---|
| 1991/92 | 83,78 |
| 1992/93 | 84,45 |
| 1993/94 | 83 |
| 1994/95 | 83,66 |
| 1995/96 | 84,26 |
| 1996/97 | 86,8 |
| 1997/98 | 83,2 |
| 1998/99 | 84,3 |
| 1999/2000 | 85,1 |
| 2000/01 | 83,4 |
| 2001/02 | 82,5 |
| 2002/03 | 83,7 |
| 2003/04 | 84 |
| 2004/05 | 84,4 |

### Колькасць абарон дысертацый супрацоўнікамі БДУ (2000–2004 гг.)

| | Доктарскія дысертацыі | Кандыдацкія дысертацыі |
|---|---|---|
| 2000 | 14 | 70 |
| 2001 | 10 | 68 |
| 2002 | 17 | 83 |
| 2003 | 16 | 97 |
| 2004 | 7 | 75 |

### Колькасць выпускнікоў (дзён. і завочн. ад.), якія атрымалі дыплом з адзнакай

| № | Факультэт | У % ад усіх вып. |
|---|---|---|
| 1 | ФМА | 29 |
| 2 | Філалагічны | 25 |
| 3 | ФПМІ | 23 |
| 4 | Гістарычны | 23 |
| 5 | ФРФЭ | 22 |
| 6 | Юрыдычны | 21 |
| 7 | Біялагічны | 21 |
| 8 | Хімічны | 19 |
| 9 | ФФСН | 16 |
| 10 | Журналістыкі | 14 |
| 11 | Геаграфічны | 11 |
| 12 | Мех.-мат. | 10 |
| 13 | ДзІКСТ | 7 |
| 14 | Эканамічны | 7 |
| 15 | Фізічны | 6 |
| 16 | Гуманітарны | 0 |
| | | |
| | Усяго | 18 |




### Размеркаванне выпускнікоў 2005 г. (дзён. ад.)




### Пасляховасць студэнтаў па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі (дзён. ад.) па БДУ



| год | % |
|---|---|
| 1991/92 | 83,26 |
| 1992/93 | 86,27 |
| 1993/94 | 83,04 |
| 1994/95 | 82,9 |
| 1995/96 | 85,2 |
| 1996/97 | 86,8 |
| 1997/98 | 85,6 |
| 1998/99 | 85,3 |
| 1999/2000 | 84,8 |
| 2000/01 | 84,7 |
| 2001/02 | 83,6 |
| 2002/03 | 85 |
| 2003/04 | 85,1 |
| 2004/05 | 83,9 |

### Вынікі экзаменацыйнай сесіі (вясна) 2004-2005 навуч. г. (дзён. ф. нав.)




### Колькасць студэнтаў, якія навучаюцца на завочным (бюджэт/платнае) аддзяленні 2005/2006 нав.г. па курсах (на 01.09.2005 г.)

| Курс | бюджэт | платнае |
|---|---|---|
| 1 | 427 | 717 |
| 2 | 411 | 559 |
| 3 | 440 | 377 |
| 4 | 472 | 399 |
| 5 | 479 | 232 |
| 6 | 439 | 142 |
| Усяго: | 2668 | 2426 |

### Колькасць студэнтаў дзённага аддзялення ў 2005/2006 нав.г. па курсах (на 01.09.2005 г.)

| курс | бюджэт | платнае |
|---|---|---|
| 1 | 1973 | 1898 |
| 2 | 1989 | 1795 |
| 3 | 1855 | 1283 |
| 4 | 1881 | 958 |
| 5 | 1798 | 847 |
| Усяго | 9496 | 6771 |




### Колькасць аспірантаў і дактарантаў (2001–2005 гг.)

| | Аспірантура | | | | Дактарантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Вочная | Завочная | Усяго | У тым ліку мэтавая (вочн./завочн.) | Дактаранты БДУ | Дактаранты пабочных арганізацый | Усяго |
| 2001 | 524 | 259 | 783 | 46/15 | 8 | 11 | 19 |
| 2002 | 544 | 286 | 830 | 50/24 | 7 | 13 | 20 |
| 2003 | 535 | 298 | 833 | 60/34 | 6 | 10 | 16 |
| 2004 | 469 | 298 | 767 | 48/38 | 6 | 9 | 15 |
| 2005 | 474 | 304 | 778 | 49/35 | 6 | 10 | 16 |

### Навуковыя публікацыі ў 2001—2004 гг.

| Колькасць публікацый | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 |
|---|---|---|---|---|
| усяго | 722 | 783 | 1003 | 896 |
| Манаграфій | 97 | 144 | 160 | 113 |
| Падручнікаў і навучальных дапаможнікаў | 385 | 437 | 537 | 532 |
| Зборнікаў навуковых прац | 61 | 51 | 100 | 65 |
| Зборнікаў тэзісаў дакладаў | 26 | 36 | 74 | 33 |
| Іншых выданняў | 153 | 115 | 132 | 153 |

### Сярэдняя нагрузка выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта




### Вынікі абароны дыпломных работ у 2005 годзе (дзённая форма навучання)

| № | Факультэт | выд. % |
|---|---|---|
| 1 | ФРФЭ | 80 |
| 2 | Філалагічны | 77 |
| 3 | Біялагічны | 75 |
| 4 | Фізічны | 74 |
| 5 | Гістарычны | 73 |
| 6 | Хімічны | 68 |
| 7 | Геаграфічны | 67 |
| 8 | Юрыдычны | 62 |
| 9 | Журналістыкі | 57 |
| 10 | ФФСН | 57 |
| 11 | Гуманітарны | 56 |
| 12 | ФМА | 55 |
| 13 | ФПМІ | 54 |
| 14 | Механіка-матэматычны | 50 |
| 15 | ДзІКСТ | 39 |
| 16 | Эканамічны | 38 |
| | | |
| | Усяго па БДУ | 62 |

| № | Факультэт | здав. % |
|---|---|---|
| 1 | ДзІКСТ | 23 |
| 2 | Гуманітарны | 22 |
| 3 | ФПМІ | 17 |
| 4 | ФМА | 10 |
| 5 | Эканамічны | 9 |
| 6 | Геаграфічны | 8 |
| 7 | Біялагічны | 7 |
| 8 | Механіка-матэматычны | 7 |
| 9 | ФФСН | 6 |
| 10 | Філалагічны | 5 |
| 11 | Юрыдычны | 4 |
| 12 | Фізічны | 3 |
| 13 | Хімічны | 3 |
| 14 | ФРФЭ | 2 |
| 15 | Гістарычны | 2 |
| 16 | Журналістыкі | 1 |
| | | |
| | Усяго па БДУ | 8 |

УНІВЕРСІТЭТ

# ВЫНІКІ РАБОТЫ БДУ Ў 2004—2005 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧЫ ПА ЎДАСКАНАЛЕННІ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У 2005—2006 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

**Прафесарска-выкладчыцкі састаў (ПВС)**
*(без сумяшчальнікаў)*

| Год | Усяго ПВС | Маюць навуковую ступень | | ПВС з нав.ступен. да агульнай колькасці | Маюць навуковае званне | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | д/навук | к/навук | | акад., чл-кар. | праф. | дацэнт | С.Н.С. |
| 2000/2001 | **1861** | 203 | 848 | **56,47%** | 3 | 156 | 618 | 39 |
| 2001/2002 | **1935** | 204 | 872 | **55,60%** | 4 | 157 | 607 | 41 |
| 2002/2003 | **1988** | 202 | 887 | **54,77%** | 2 | 151 | 609 | 38 |
| 2003/2004 | **2039** | 206 | 899 | **54,19%** | 2 | 154 | 624 | 39 |
| 2004/2005 | **2140** | 208 | 935 | **53,41%** | 5 | 157 | 643 | 39 |

**Бюджэтныя асігнаванні комплексу БДУ за перыяд 2001—2005 гг. (млн руб.)**




| Гады | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 (план на 01.10.2005) |
|---|---|---|---|---|---|
| Асігнаванні, у млн руб. | 29 337,90 | 34 552,20 | 60 633,20 | 70 629,00 | 77 946,1 |

**Пастupленне сродкаў у навуковую і навукова-тэхнічную сферу БДУ 2001–2005 гг. (млн руб.)**

| | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 (план) |
|---|---|---|---|---|---|
| Агульны аб'ём фінансавання | 9819,2 | 11867,9 | 15028,5 | 20669,1 | 26869,8 |
| Фундаментальныя даследаванні | 1522,5 | 1814,0 | 2753,2 | 4156,5 | 5521,5 |
| ДНТП, інавацыйныя праекты | 3527,2 | 3854,8 | 5431,7 | 7366,9 | 8220,4 |
| Гасдагаворы | 1504,5 | 2488,0 | 3014,9 | 4433,3 | 5250,0 |




**Сярэдні ўзрост прафесарска-выкладчыцкага саставу** (без сумяшчальнікаў)

| Факультэт | прафесары |
|---|---|
| ФМА | 50 |
| Эканамічны | 53 |
| Філалагічны | 57 |
| ФФСН | 58 |
| Юрыдычны | 60 |
| Журналістыкі | 61 |
| Агульнаувівер. кафедры | 61 |
| Біялагічны | 62 |
| ФПМІ | 64 |
| Гістарычны | 64 |
| Фізічны | 67 |
| ДзІКСТ | 68 |
| Хімічны | 68 |
| ФРФЭ | 70 |
| Геаграфічны | 71 |
| ММФ | 71 |
| па БДУ | 62 |

← У сярэднім па БДУ

| Факультэт | ПВС |
|---|---|
| Гуманітарны | 43 |
| ФМА | 43 |
| Эканамічны | 44 |
| Філалагічны | 44 |
| ФФСН | 45 |
| Юрыдычны | 46 |
| Журналістыкі | 47 |
| ДзІКСТ | 47 |
| Агульнаунівер. кафедры | 48 |
| Біялагічны | 48 |
| ФПМІ | 50 |
| Гістарычны | 50 |
| Фізічны | 51 |
| Хімічны | 51 |
| ФРФЭ | 51 |
| Геаграфічны | 51 |
| ММФ | 52 |
| па БДУ | 47 |

**Звесткі пра сярэднюю заработную плату работнікаў БДУ (2001—2005 гг.) (тыс.руб.)**




## КАНФЕРЭНЦЫІ

## БІБЛІЯТЭКА Ў XXI СТАГОДДЗІ

***Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Фундаментальная бібліятэка БДУ правялі 25—27 кастрычніка Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Роля бібліятэк і інфармацыі ва ўстойлівым развіцці грамадства".***

У канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры, вядучыя спецыялісты Нацыянальнай і рэспубліканскіх галіновых бібліятэк Беларусі, кіраўнікі абласных і публічных бібліятэк, бібліятэк адукацыйных устаноў з усіх рэгіёнаў Беларусі, члены Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, прадстаўнікі Таварыства бібліятэкараў Літвы, амерыканскай, расійскай і ўкраінскай бібліятэчных асацыяцый. Усяго было зарэгістравана больш за 300 удзельнікаў канферэнцыі.

Канферэнцыя ставіла сваімі мэтамі абмеркаванне задач бібліятэк як сацыякультурных і інфармацыйных цэнтраў грамадства ў забеспячэнні яго ўстойлівага развіцця, удасканальванне інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва Беларусі на аснове выкарыстоўвання сучасных камп'ютарных і тэлекамунікацыйных тэхналогій, умацаванне ролі бібліятэк як інстытута нацыянальнай культуры і нацыянальнай памяці, развіццё інфармацыйнага ўзаемадзеяння і эфектыўнага супрацоўніцтва бібліятэк на рэгіянальным, нацыянальным і міжнародным узроўнях.

**Аксана КАХНО**

## МАСТАЦТВА І ФІЛАСОФІЯ

***21-23 кастрычніка ў БДУ адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Мастацтва і філасофія", прысвечаная стагоддзю з дня нараджэння Ж.-П. Сартра і Э. Левінаса.***

Арганізатарамі канферэнцыі сталі кафедра мастацтваў, Цэнтр візуальных мастацтваў і медыя Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій, факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ, Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА ў Беларусі, пасольства Францыі ў Беларусі, прадстаўніцтва Сусветнага ОРТ у Рэспубліцы Беларусь. Канферэнцыя праводзілася пры ўдзеле часопісаў "Арт-прэс" (Парыж), "Мастацтва", Гётэ-інстытута (Мінск). У канферэнцыі прынялі ўдзел як навукоўцы з Беларусі, так і з Італіі, Францыі, Расіі і інш. Падчас цырымоніі адкрыцця ўдзельнікаў віталі прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар У.Л. Клюня і аташэ па культуры Пасольства Францыі ў Беларусі Жан-П'ер Бузік і інш.

Місія канферэнцыі ў звароце сучаснага грамадства да вопыту культурнай традыцыі, асэнсаванне тых яе аспектаў, якія могуць стаць актуальнымі пры пераадоленні складанасцяў сучаснай культурнай сітуацыі. Як было зазначана ў праграме, "стогадовы юбілей Ж.-П. Сартра і Э. Левінаса стымулюе пераасэнсаванне кардынальных пытанняў, пастаўленых філасофамі і іх сучаснікамі, — як суадносяцца мастацтва і філасофія ў еўрапейскім культурным цэлым".

Асноўнымі кірункамі канферэнцыі сталі пытанні ўзаемадзеяння мастацтва і філасофіі ў развіцці еўрапейскай культуры; філасофія, мастацтва і віртуальнае; філасофія праектавання і культура XX ст.; дэгуманізацыя мастацтва ў XX ст.; праблемы рэальнасці ў мастацтве на сучасным этапе; віртуальнае, рэальнае і тыражаванае ў мастацтве і г.д.

Па выніках канферэнцыі запланавана выданне зборніка матэрыялаў.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

## "ЛЮДЗЯМ ПАСПАЛІТЫМ..."

"Калі мне паведамілі, што ў германскім Гёрліцы ёсць кніга Скарыны, я не паверыў, — кажа германскі славіст Норберт Рандаў. — Усе экзэмпляры выдатна вядомыя ў свеце. Але варта было паглядзець на тытульны ліст, на партрэт аўтара..."

Да сусветна вядомых 258 экзэмпляраў Скарынавых кніг дадалося яшчэ 8: у бібліятэцы германскага горада Гёрліца знайшлі "Біблію", перакладзеную і надрукаваную Францыскам Скарынам у Празе ў 1518—1519 гг. Пра яе ішла размова 24 кастрычніка ў актавай зале журфака. Каб паведаміць падрабязнасці пра знаходку, у Мінск спецыяльна прыехаў вядомы германскі славіст Норберт Рандаў.

Знойдзеная Скарынава "Біблія" складаецца з дзвюх частак і змяшчае значную частку перакладзеных асветнікам твораў, збольшага кнігі Старога Запавета: 687 аркушаў, альбо 1358 старонак. На верхнім полі кожнай — імя ўладальніка на латыні: "Я належу Ёганесу Хесу, тэолагу, падарунак ад спадара Андрэаса Пана".

Каштоўнасць знаходкі пацвердзіў і вядомы беларускі літаратуразнаўца Адам Мальдзіс. А сустаршыня "Таварыства беларуска-нямецкіх сустрэч" Ёганес Шлоц дадаў: "Калі я быў студэнтам, я верыў, што славуты гуманіст Франц Скорын — немец. Тым прыемней сёння гутарыць пра беларуса Францыска Скарыну і яго знойдзеную ў Германіі "Біблію", якая выклікала ў маёй краіне вялікую цікавасць. Магчыма, дзякуючы кнізе Беларусь у Германіі будзе ўспрымацца так, як яна таго вартая".

Нягледзячы на гэта, падарыць знаходку Беларусі Германія не спяшаецца. "Гэтае пытанне — да бургамістра Гёрліца, — зазначыў прадстаўнік пасольства Германіі ў Беларусі, — дзе "Біблія" столькі часу захоўвалася. А вось прывезці кнігу ў Мінск на выставу — без праблем і з вялікім задавальненнем". Так што чакаем...

**Марыя КАСЦЮКОВІЧ**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

## ЛІЦЭЙСКІЯ "ВІЗІТОЎКІ"

28 кастрычніка, як і кожны год, у ліцэі БДУ адбылося адно з самых яркіх святаў, якое называецца "Візітоўкі". Амаль два месяцы ліцэй з нецярплівасцю чакаў урачыстага вечара. Для дзесяцікласнікаў гэта шанц заявіць пра сябе — своеасаблівы "першы выхад у свет": кожны клас павінен выступіць з нумарам, па якім складзецца першае ўражанне пра калектыў і які надалей стане візітнай карткай. Для адзінаццатых класаў канцэрт — гэта не толькі знаёмства з "карапузамі" (так у ліцэі называюць дзесяцікласнікаў), але і незабыўнае феерычнае шоу.

Гэты год не стаў выключэннем. Свята зацікавіла ўсіх: у актавай зале, як заўжды, не засталося ніводнага свабоднага месца, бо на здольнасці дзесяцікласнікаў прыйшлі паглядзець не толькі ліцэісты і настаўнікі, але і выпускнікі. Вечар атрымаўся на славу! Адны зрабілі сваю візітоўку падобнай да КВЗ, другія паклалі ў аснову выступу сюжэт якога-небудзь знакамітага твора (паэму Някрасава "Каму на Русі жыць добра" перапрацавалі ў "Каму ў ліцэі жыць весела"), трэція прыдумалі казку пра з'яўленне свайго профілю. Усе выступы былі не падобныя адзін на другі, аднак кожны нумар быў насычаны гумарам, спевамі і танцамі.

Усе выступленні былі ўзнагароджаны. Прадстаўленні ўсіх класаў былі настолькі яркімі, што вызначыць пераможцам толькі аднаго было немагчыма: сёлета пераможцамі сталі ўсе ўдзельнікі. Кожны з 12 класаў атрымаў запаветнае першае месца ў сваёй намінацыі.

**Вікторыя ПЫЖЫК, навучэнка ліцэя БДУ**

## КОНКУРСЫ

# ОДЫ БДУ

Падведзены вынікі творчага конкурсу, прысвечанага дню заснавання БДУ. Першае месца заняла навучэнка 11 класа ліцэя БДУ Лейла Ісмаілава (аповед "Духоўнае адкрыццё"). На другім месцы апынуўся студэнт-трэцякурснік механіка-матэматычнага факультэта Аляксей Грамыка (верш "Да БДУ"). Трэцяе месца дасталася курсанту ваеннага факультэта Дзянісу Враб'ёву ("Ода БДУ" на сучасны лад). Асобную падзяку за ўдзел у конкурсе камітэт БРСМ БДУ выказвае былому педагогу студгарадка Эміліі Фёдараўне Міхалап, якая даслала верш "Майму універсітэту".

# РОЛІК СУПРАЦЬ ЦЫГАРЭТЫ

У конкурсе творчых работ пра шкоду курэння, праведзенага камітэтам БРСМ БДУ разам са Студэнцкім саюзам нашага універсітэта, першае месца заняў відэаролік студэнта III курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Аляксандра Карповіча. Другое месца падзялілі студэнткі-другакурсніцы факультэта журналістыкі Яраслава Ананка і Таццяна Русаковіч. На трэцім месцы апынуліся студэнтка I курса эканамічнага факультэта Юлія Хмялеўская і студэнт IV курса гістарычнага факультэта Уладзімір Палаўчэня. Урачыстая ўзнагарода пераможцаў адбудзецца 17 лістапада падчас дыскатэкі ў Палацы Рэспублікі. Усе ўдзельнікі атрымаюць грашовыя прэміі, а пераможцы — яшчэ і дыпломы з памятнымі падарункамі.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

## ПОСТФАКТУМ

# АБМЕН ВОПЫТАМ: СЕМІНАРЫ ПА ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ

На базе спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыганціна" **21—22 кастрычніка** упершыню прайшоў выязны навучальны семінар для куратараў вучэбных груп. Тэмай яго была "Сістэма ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце". Удзел у ім прынялі куратары на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворавым, прадстаўнікі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, студэнцкага гарадка, псіхалагічнай службы БДУ, кафедры фізвыхавання і спорту, упраўлення па справах культуры, наменнікі дэканаў і загадчыкі інтэрнатаў. Адбыліся семінары з намеснікамі дэканаў па выхаваўчай рабоце на тэму "Студэнцкі савет па якасці адукацыі факультэта як сродак рэарганізацыі адукацыйнага працэсу", семінар загадчыкаў інтэрнатаў "Узаемадзеянне органаў студэнцкага самакіравання БДУ з адміністрацыяй інтэрнатаў". Вядома, не абышлося і без актыўнага адпачынку: басейн і турнір па валейболе нікога не пакінулі абыякавым.

**Святлана ДАЛГАНЮК**

## ПОСТФАКТУМ

# Тыдзень маці ў БДУ

***З нагоды 14 кастрычніка — Дня маці цэлы тыдзень (з 10-га па 16-га) у Беларусі адзначаўся як Тыдзень маці. Добрае надвор'е спрыяла цудоўнаму настрою, гандляры кветкамі радаваліся паўлічаным заробкам, а дзеці ўсёй краіны прызнаваліся сваім маці ў любові.***



У арганізацыі святочных мерапрыемстваў у БДУ прынялі ўдзел Саюз жанчын БДУ, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, упраўленне па справах культуры, студгарадок, прафсаюзныя арганізацыі студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта і інш.

У інтэрнаце № 7 прайшла выстава "Апошняя ўсмешка восені", арганізатарамі якой выступілі намеснік дырэктара студэнцкага гарадка Ала Мелех і дацэнт кафедры мікрабіялогіі Рыма Жалдакова. У мерапрыемстве ўдзельнічалі Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва, Цэнтральны батанічны сад, Батанічны сад БДУ і асобныя супрацоўнікі універсітэта. На выставе можна было пабачыць восеньскія букеты і асобныя кветкі, абмяняцца насеннем і саджанцамі, атрымаць кансультацыю па пэўных раслінах.

Штогод на Дзень маці праводзіцца дабрачынная акцыя для жанчын-ветэранаў універсітэта "Мы помнім вас": супрацоўнікі ад кожнага факультэта выязджаюць на дом да пажылых выкладчыц, дзе віншуюць іх з Днём маці.

Пасяджэнне клуба "Студэнцкая сям'я — XXI стагоддзе" — гэта сумесны праект такіх арганізацый, як "Саюз жанчын БДУ" і "Надзея-экспрэс". Каардынатарам праекта выступіла загадчыца кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі В.Л. Жук. "На агеньчык" да маладых сем'яў зазірнулі спецыялісты ў галіне акушэрства і гінекалогіі, касметалогіі і моды. Сваю калекцыю "Акварыум" прадэманстраваў мадэльер Саша Варламаў.

У рамках праграмы "Два саюза — дзве перспектывы", каардынатарам якой з'яўляецца старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Н.М. Радзевіч, адбылася паездка маладых мам, студэнтак і аспірантак у Жыровіцкі манастыр.

У рамках Тыдня маці адбыліся таксама юрыдычныя кансультацыі для жанчын па жыллёвым, працоўным і сямейным праве; дабрачынная акцыя ў падтрымку шматдзетных сем'яў; спектакль народнага студэнцкага тэатра "На балконе"; выстава карцін мастака Аляксея Кузьміча пад назвай "Мадонна". Супрацоўнікі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ наладзілі вечарыну з выставай дзіцячых творчых работ і дзіцячым канцэртам "Для нашых мам". З нагоды Дня маці адбыўся штогадовы святочны канцэрт. Акрамя таго, на мерапрыемствах пабывалі прадстаўнікі Асацыяцыі універсітэцкіх жанчын Літвы. Падагульніла святочны тыдзень сустрэча рэктара В.І. Стражава з матулямі таленавітых студэнтаў у рэктараце БДУ.

**Яўгенія МАНЦЭВІЧ,**
**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ЮБІЛЕІ

***13 кастрычніка ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі навуковых прац і кніг заслужанага дзеяча навукі БССР, прафесара І.Р. Некрашэвіча, аўтара звыш 200 навуковых публікацый. Нагодай для мерапрыемства стаў 100-гадовы юбілей з дня нараджэння навукоўца.***



# ПАМЯЦЬ АБ ПРАФЕСАРУ НЕКРАШЭВІЧУ

Ілля Рыгоравіч — першы беларускі навукоўца, які займаўся даследаваннем з'яў кантакту метала з паўправаднікам. Ён адзін з тых, каму мы абавязаны аднаўленнем лабараторнай базы універсітэта пасля вайны.

Сярод яго студэнтаў — рэктар БДУ В.І. Стражаў, прарэктар па вучэбнай рабоце В.В. Самахвал, а таксама дэкан фізічнага факультэта В.М. Анішчык і дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі С.Р. Мулярчык.

Старшыня Савета ветэранаў універсітэта І.П. Зяцькоў спачатку быў студэнтам Іллі Рыгоравіча, а потым і яго кіраўніком. Пра свайго настаўніка ён кажа так:

— Ілля Рыгоравіч — фізік з вялікай літары. Развіццё фізікі ў БДУ звязана з яго даследаваннямі, яго працай.

Шмат цікавага паведаміў пра Іллю Рыгоравіча яшчэ адзін яго колішні студэнт — С.Р. Мулярчык:

— Прафесар Некрашэвіч паставіў рэкорд, які цяжка будзе пабіць: ён быў нязменным кіраўніком кафедры агульнай фізікі БДУ. Не ведаю чалавека, больш патрабавальнага, чым ён. Прычым патрабавальнага ў першую чаргу да сябе (ён лічыў, што 200 навуковых прац недастатковая лепта ў развіццё навукі, ён прагну вялікага адкрыцця), а толькі потым да студэнтаў.

Выступіла і дачка прафесара Некрашэвіча — Мая Ільінічна. Яна выказала ўдзячнасць арганізатарам выстаўкі: дырэктару ФБ БДУ П.М. Лапо, яго намесніцы А.В. Буцінай, адказнай за правядзенне выстаўкі Л.І. Янковіч.

— У нашай сям'і не было культу дываноў і хрусталя, — кажа Мая Ільінічна, — затое было захапленне кнігамі і падарожжамі. Бацька выпісваў больш за 20 выданняў. Памятаю, як на велізарных грузавіках з дапамогай супрацоўнікаў бібліятэкі і студэнтаў перавозілі тое, што бацька перадаў у дар бібліятэцы.

Памяць пра выдатнага фізіка будзе жыць сярод тых студэнтаў БДУ, якія рыхтуюцца па яго падручніках, займаюцца ў аўдыторыях універсітэта, адна з якіх названа імем прафесара Некрашэвіча.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# УЗНАГАРОДЫ ДЛЯ ПРАЦАВІТЫХ

Урачыстае закрыццё III працоўнага семестра "Лета — 2005" адбылося **20 кастрычніка** ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Мінскі гарадскі штаб студэнцкіх атрадаў і аддзел па справах моладзі Мінгарвыканкама ўручылі студгарадку БДУ пераходны кубак "За арганізацыю дзейнасці рамонтна-будаўнічых брыгад". Камітэт БРСМ БДУ атрымаў кубак у намінацыі "Найлепшы валанцёрскі атрад" за арганізацыю працы краязнаўчага атрада ў зоне Аўгустоўскага канала.

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю віншуе ўсіх з гэтымі ўзнагародамі і дзякуе ўдзельнікам студэнцкіх атрадаў за добрасумленную працу.

**Святлана ДАЛГАНЮК**

## АБ'ЯВЫ


# КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын" ("БАМХЖ") абвяшчае аб працягу конкурсу навуковых работ сярод студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў на 2005 г. па праблеме гандлю людзьмі.

Конкурс арганізаваны ў рамках праграмы "Ла Страда 2005: Прадухіленне гандлю жанчынамі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы". Да ўдзелу запрашаюцца студэнты I—V курсаў, магістранты і аспіранты 1-га году навучання ВНУ Беларусі. Жадаючыя ўзяць удзел у конкурсе павінны да **10 снежня** 2005 г. падаць у ГА "БАМХЖ":

а) запоўненую анкету ўдзельніка конкурсу;

б) копіі сваіх найлепшых работ па тэматыцы конкурсу.

Пераможцам конкурсу будзе выплачвацца стыпендыя ў перыяд з лютага па красавік 2006 г. уключна.

**Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэл. (029) 645-31-66 ці электроннай поштай lastrada@infonet.by**

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: сацыяльнай камунікацыі, усходніх моў, сацыяльна-гуманітарных навук;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, агульнай фізікі, тэарэтычнай фізікі, культуралогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, псіхалогіі, інтэлектуальных сістэм;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, усходніх моў, культуралогіі, раманскіх моў, псіхалогіі, сацыяльнай камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, сацыялогіі;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: энергафізікі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

## УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ"

**абвяшчае конкурс**

на замяшчэнне пасады выкладчыка кафедры агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін.

**Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Камсамольская, 21, аддзел кадраў, тэл. 229-29-46.**



УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

8 лістапада 2005 года
Падпісана да друку 4.11.2005 г.
Зак.1002 . Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by